ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 8 (568) | Субота, 17 сакавіка 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## УЗНАГАРОДЫ ЎРУЧАНЫ



У адпаведнасці з нядаўна прынятым Законам аб працоўных калектывах на гэтым тыдні ва універсітэце адбылася канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў. З дакладам «Аб стане ўкаранення навуковых работ у вытворчасць» выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар М. В. Навучыцель. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел загадчык праблемнай навукова-даследчай лабараторыі М. І. Ягоранкаў, загадчык кафедры філасофіі прафесар У. М. Калмыкоў, загадчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання дацэнт У. А. Баркоў, старшы навуковы супрацоўнік кафедры оптыкі М. І. Аляшкевіч, загадчык НДС М. І. Твардоўскі.

У прынятай пастанове прадугледжваецца павысіць актыўнасць і адказнасць выканаўцаў гаспдагаворных і дзяржбюджэтных распрацовак за своечасовае ўкараненне іх у вытворчасць.

На канферэнцыі былі ўручаны ўзнагароды пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод факультэтаў і кафедр за 1983 год і зацверджаны сацыялістычныя абавязацельствы, прынятыя на 1984 год.

**НА ЗДЫМКУ: в. а. рэктара член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў уручае пераходны Чырвоны сцяг дэкану У. Ф. Філіпцову і сакратару партбюро Л. Я. Палякову з матэматычнага факультэта, які выйшаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва за 1983 год.**

Фота А. Пашкевіча.

## *У парткоме* МАЛАДЫМ — УВАГУ І КЛОПАТ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта абмеркавана пытанне аб рабоце пярвічных партыйных арганізацый структурных падраздзяленняў універсітэта з маладымі камуністамі. Заслуханы паведамленні сакратароў партыйных бюро Т. П. Жалонкінай з фізічнага факультэта, В. А. Хількевіча з біяфака, Л. Н. Сечкі з факультэта фізвыхавання, намесніка сакратара партбюро гістфіла А. К. Няронскай, члена парткома, дэкана эканамічнага факультэта У. Д. Арэшчанкі. Выступілі таксама члены парткома дацэнт кафедры гісторыі КПСС Я. А. Семянчук, сакратар камітэта ЛКСМБ А. М. Кусянкоў, сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Партком адобрыў практыку партарганізацыі фізічнага факультэта, дзе арганізавана настаўніцтва над маладымі камуністамі з ліку вопытных членаў КПСС і рэкамендаваў іх вопыт выкарыстоўваць на ўсіх факультэтах. У прынятай пастанове прадугледжаны і іншыя меры па далейшаму паляпшэнню работы з маладымі камуністамі універсітэта.

## ІДЗЕ РАЗМЕРКАВАННЕ

Новы атрад спецыялістаў падрыхтаваны сёлета ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. На гэтым тыдні праходзіла іх размеркаванне на працу.

Першымі атрымлівалі накіраванні на працу пяцікурснікі самага буйнага ва універсітэце факультэта — эканамічнага. Вялікія патрэбы народнай гаспадаркі ў гэтых спецыялістах. Сёлета эканомфак даў пуцёўку ў самастойнае працоўнае жыццё 170 юнакам і дзяўчатам.

Перад камісіяй — выпускнікі аддзялення эканомікі працы. Адна з лепшых студэнтак факультэта Наталля Савасценка атрымала накіраванне на Брэсцкі электрамеханічны завод. У адным з праектных інстытутаў сталіцы нашай рэспублікі будзе працаваць Людміла Тарарэнка. Паедуць на работу на завод «Мазыркабель» Іна Вараб'ёва і Міхаіл Булаўкін. Працоўная біяграфія Маргарыты Шалейка пачнецца на Мінскім механічным заводзе імя Вавілава.

Шырокая геаграфія месц прызначэння пяцікурснікаў аддзялення АМАЭІ — гарады нашай рэспублікі, Расійскай Федэрацыі — Яраслаўль, Калінін, Томск, Цюмень і інш.

Пуцёўку ў працоўнае жыццё атрымалі выпускнікі ўсіх факультэтаў.

(Наш. кар.)



**На адным з прадпрыемстваў г. Гомеля будзе працаваць выпускніца аддзялення АМАЭІ эканамічнага факультэта Таццяна Селядцова. Сваім подпісам яна падмацоўвае рашэнне камісіі па размеркаванню аб накіраванні яе на працу.**

Фота А. Пашкевіча.

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

## КАЛЕКТЫВУ ГДУ НА 1984 ГОД

Кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда КПСС, пастановамі чэрвеньскага, снежаньскага (1983 г.) і лютаўскага (1984 г.) Пленумаў ЦК КПСС, калектыў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва **па** дастойнай сустрэчы 40-годдзя вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прымае наступныя абавязацельствы:

1. Забяспечыць план выпуску спецыялістаў.

2. **По рабоце з выпускнікамі універсітэта**:

— павысіць узровень прафесійнай і ідэйна-тэарэтычнай падрыхтоўкі выпускнікоў ГДУ;

— пашыраць і ўдасканальваць сувязі са школамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі, на якія накіраваны маладыя спецыялісты;

— на 10% павялічыць колькасць станоўчых водзываў з месца работы маладых спецыялістаў.

3. **У справе падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў:**

— абараніць 1 доктарскую дысертацыю;

— абараніць 14 кандыдацкіх дысертацый;

— забяспечыць 100% выкананне плана прыёму ў аспірантуру і выпуску аспірантаў. Дабіцца 60%-га выпуску аспірантаў з абаронай і прадстаўленнем дысертацый у спецыялізаваны савет у вызначаны тэрмін;

— накіраваць на стажыроўку і павышэнне кваліфікацыі не менш 20% выкладчыкаў універсітэта.

4. **У галіне арганізацыі і ўдасканальвання вучэбна-метадычнай работы:**

— выдаць 10 назваў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў агульным аб'ёмам 45 д. арк. Падрыхтаваць да выдання вучэбных і метадычных дапаможнікаў у колькасці 50 назваў агульным аб'ёмам 80 д. арк.;

— давесці да 35% колькасць дыпломных праектаў і работ, рэкамендаваных ДЭК да ўкаранення і друку.

5. **У галіне развіцця навукова-даследчых работ і практычнай рэалізацыі атрыманых вынікаў:**

— давесці аб'ём гаспдагаворных работ да 1,6 млн. руб. Усе работы па плану 1984 года завяршыць своечасова. Давесці агульную колькасць работ, якія адносяцца да важнейшай тэматыкі, да 75%;

— забяспечыць датэрміновае, да 25 снежня 1984 года, выкананне плана ўкаранення завершаных навукова-даследчых работ і плана эканамічнай эфектыўнасці. Укараніць не менш 14 работ і забяспечыць эканамічны эфект не менш 1,9 млн. руб.;

— падаць у Камітэт па справах вынаходстваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР не менш 47 заявак на вынаходства і атрымаць 16 станоўчых рашэнняў;

— апублікаваць 3 манаграфіі, 147 навуковых артыкулаў і прадставіць 108 дакладаў і паведамленняў на ўсесаюзныя, рэспубліканскія і рэгіянальныя канферэнцыі;

— правесці гадавыя навуковыя чытанні і агляд-конкурс навуковых работ маладых вучоных універсітэта.

6. **Па прыцягненню студэнтаў да навукова-даследчай работы:**

— давесці працэнт студэнтаў старшых курсаў дзённага аддзялення, якія прымаюць удзел у выкананні дзяржбюджэтнай і гаспдагаворнай тэматыкі, да 30%;

— давесці колькасць студэнцкіх работ, якія адзначаны медалямі, дыпломамі і прэміямі па выніках Усесаюзных конкурсаў, да 5;

— апублікаваць сумесна са студэнтамі не менш 67 навуковых артыкулаў. Укараніць у вытворчасць і вучэбны працэс 44 студэнцкія работы;

— арганізаваць выстаўку навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў і аспірантаў.

7. **Па сацыяльна-эканамічных мерапрыемствах;**

— забяспечыць усіх іншагародніх студэнтаў месцамі ў інтэрнатах;

—выдаць 1050 студэнцкіх пуцёвак у прафілакторый;

— забяспечыць 80 месц у спартыўна - аздараўленчым лагеры і выдаць 395 пуцёвак.

8. **Па выхаваўчай рабоце:**

— забяспечыць удзел 2480 студэнтаў у лектарска-прапагандысцкай і агітацыйна-масавай рабоце;

— ахапіць навучаннем на факультэце грамадскіх прафесій 2200 студэнтаў;

— забяспечыць удзел 950 студэнтаў дзённага аддзялення ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.

9. Ажыццявіць комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнню ўмоў аховы працы і вытворчай санітарыі, запланаваных на 1984 год.

10. Кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда КПСС, забяспечыць рацыянальнае выкарыстанне энергетычных, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, весці рашучую барацьбу з безгаспадарчасцю і марнатраўствам.

11. Правесці агульнауніверсітэцкую спартакіяду «Здароўе» сярод супрацоўнікаў па 8 відах і універсіяду студэнтаў па 16 відах спорту. Падрыхтаваць 6 майстроў спорту, 21 кандыдата ў майстры спорту, 63 спартсмены І разрада, 1401 спартсмена масавых разрадаў і 1201 значкіста ГПА, 1103 грамадскія інструктары, 568 суддзяў па спорту.

12. Выкладчыкам і студэнтам прачытаць перад насельніцтвам горада і вобласці не менш 5000 лекцый па актуальных праблемах знешняй і ўнутранай палітыкі Савецкай дзяржавы і прапагандзе навукова-тэхнічных ведаў.

13. Працягваць аказанне шэфскай дапамогі саўгасу «Рэчкі» Веткаўскага раёна ва ўмацаванні яго матэрыяльна-тэхнічнай базы, нарыхтоўцы грубых і сакавітых кармоў для грамадскай жывёлагадоўлі.

**САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ АБМЕРКАВАНЫ НА ФАКУЛЬТЭТАХ, КАФЕДРАХ І Ў ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯХ ГДУ І ПРЫНЯТЫ НА КАНФЕРЭНЦЫІ КАЛЕКТЫВУ УНІВЕРСІТЭТА.**

## *ВІНШУЕМ!*

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра вышэйшай матэматыкі горача віншуюць дацэнта гэтай кафедры ШАЙМУРАТАВА Рафата Вафаевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара тэхнічных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, кафедра заалогіі і аховы прыроды горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ВЕРАМЕЕВА Васіля Мікалаевіча (навуковы кіраўнік — прафесар Б. П. Савіцкі) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук.**

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра оптыкі горача віншуюць выпускніка аспірантуры ГДУ МІЦЮРЫЧА Георгія Сямёнавіча (навуковы кіраўнік — акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

*Рашэнні лютаўскага (1984 г.) Пленума ЦК КПСС — у жыццё!*

# СХОД КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

На гэтым тыдні ў актавай зале адбыўся сход камсамольскага актыву універсітэта. З дакладам аб задачах камсамольскай арганізацыі ГДУ, вынікаючых з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша К. У. Чарненкі на нечарговым лютаўскім (1984 г.) Пленуме ЦК КПСС, выступіў сакратар камітэта ЛКСМБ А. Кусянкоў. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: член камітэта камсамола, ленінскі стыпендыят С. Рыдны з біяфака, метадыст факультэта грамадскіх прафесій Л. Галеева, сакратар камсамольскага бюро матэматычнага факультэта В. Шведаў, начальнік штаба працоўных спраў, намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце А. Шалдукова, камсорг лепшай акадэмічнай групы універсітэта Г-41 гісторыка-філалагічнага факультэта Т. Мальцава, старшыня прафкома студэнтаў Н. Колтышава, намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ эканамічнага факультэта А. Лішык.

У рабоце сходу камсамольскага актыву прыняла ўдзел і выступіла сакратар Цэнтральнага РК ЛКСМБ г. Гомеля Н. Падзорава.

У прынятай на сходзе пастанове прадугледжана накіраваць намаганні камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп, курсаў і факультэтаў на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй, актывізацыю іх навукова-даследчай дзейнасці, больш шырокае прыцягненне да ўдзелу ў грамадскім жыцці і камуністычным выхаванні моладзі. Пастаўлена задача ўсямерна дамагацца павышэння вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны, узорнай падрыхтоўкі будаўнічых атрадаў да новага працоўнага семестра.

## *Вучоба — галоўная праца студэнта*

**Зноў у прывычным рытме цячэ студэнцкае жыццё — лекцыі, практычныя, семінарскія заняткі. Забыліся хваляванні зімовай экзаменацыйнай сесіі. У штодзённых справах час ляціць непрыкметна. Не паспееш азірнуцца, як наступіць чарговае выпрабаванне на веды студэнтаў. Што трэба зрабіць для таго, каб не паўтарыць памылак і пралікаў зімовай сесіі, вытрымаць летнія экзамены больш упэўнена, паспяхова? Перш за ўсё крытычна і прынцыпова ўскрыць прычыны дрэннай паспяховасці студэнтаў. Гэта імкнуліся зрабіць у змешчаным ніжэй артыкуле старшыня Савета выдатнікаў ГДУ С. Рыдны і старшыня ВВК універсітэта Г. Ільюшчанка.**

# ДВОЙКА ЗА ЛЯНОТУ

ПА ВЫНІКАХ зімовай экзаменацыйнай сесіі абсалютная паспяховасць па універсітэту склала 90%. Гэта на 1,8% вышэй у параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года. Першае месца па паспяховасці заняў гісторыка-філалагічны факультэт, абсалютная паспяховасць на якім склала 96,4%. На другім месцы аказаліся будучыя біёлагі — 92,5%, трэцім — эканамісты — 91,7%. Чацвёртае месца заняў фізічны факультэт — 88,9%, пятае — геафак — 86,1%, шостае — матфак — 84,8%, сёмае — факультэт фізічнага выхавання — 82%.

Трэба адзначыць, што на гістфіле ў параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года абсалютная паспяховасць знізілася на 1,3%, на геалагічным факультэце — на 1%. У горшы бок змянілася паспяховасць і на факультэце фізвыхавання — на 6,2%. А вось біёлагі, эканамісты і фізікі палепшылі свае вынікі.

У мінулую зімовую экзаменацыйную сесію абсалютная паспяховасць ва універсітэце па грамадскіх дысцыплінах склала 98,3%. На «выдатна» здалі грамадскія дысцыпліны 23,4% студэнтаў ГДУ, на «добра» — 49,1%, на «здавальняюча» — 25,8%, на «нездавальняюча» — 1,7% студэнтаў. Як бачна з лічбаў, паспяховасць студэнтаў па грамадскіх дысцыплінах вышэйшая, чым па спецыяльных.

310 студэнтаў вытрымалі зімовую сесію толькі на «выдатна» (9,2% ад агульнай колькасці студэнтаў), 758 — на «добра» і «выдатна» (22,5%), 441 — на «добра» (13,1%), 291 — на «здавальняюча» (8,6%). Двойкі атрымалі 196 студэнтаў (5,8%).

Нягледзячы на некаторае змяншэнне колькасці пропускаў заняткаў студэнтамі па няўважлівых прычынах, наведванне заняткаў яшчэ жадае быць намнога лепшым. Негатыўныя адносіны асобных студэнтаў да наведвання лекцый і практычных заняткаў знаходзяць сваё адлюстраванне ў іх дрэннай паспяховасці.

Яшчэ Платон гаварыў: «Вельмі дрэнны чалавек, які нічога не ведае і не імкнецца аб чым-небудзь даведацца, таму што ў ім спалучаюцца ў адно цэлае дзве заганы — няведанне і нежаданне ведаць». А ва універсітэце, на жаль, шмат такіх сярэдніх, бязлікіх студэнтаў, якіх вучоба не цікавіць і яны адстаюць па паспяховасці ад сваіх аднакурснікаў.

У чым жа прычыны гэтай негатыўнай рэальнасці, у чым карані дрэннай здачы сесіі такімі студэнтамі? Савет выдатнікаў і вучэбна-выхаваўчая камісія універсітэта правялі анкетаванне студэнтаў розных факультэтаў. Прыводзім некаторыя адказы студэнтаў:

«Прычына дрэннай здачы сесіі — дрэнная падрыхтоўка. Усе самі вінаватыя».

«У чым прычына дрэннай паспяховасці? У сваім характары, слабаволлі».

«У недастатковай падрыхтоўцы, у няўменні правільна і рацыянальна размеркаваць свой час...»

«Для добрай здачы сесіі патрэбны сілы, а волі, каб сабраць іх, не было».

«У недахопе часу, неразуменні адказнасці...»

«У няўменні распараджацца сваім часам, у адсутнасці навыку студэнцкага жыцця...»

Другія студэнты-першакурснікі (на жаль, такіх аказалася нямала) адказалі на гэта пытанне адным словам: «лянота».

Вось гэта лянота і з'яўляецца крыніцай дрэннай паспяховасці, адсталасці ў мысленні. Сучасны рытм жыцця патрабуе ад чалавека маштабнасці, універсальнасці, дынамізму мыслення, пашырэння кругагляду. Фактарамі развіцця універсальнасці мыслення чалавека з'яўляецца глыбокі прафесіяналізм, шырокі светапоглядавы, філасофскі, культурны кругагляд, здольнасць да мэтанакіраванай працы. Але ўсё гэта не ўласціва тым студэнтам, якія прама распісваюцца ў сваёй бездапаможнасці. Да іх адносяцца В. Рылікаў, А. Позур, Г. Жураў, Н. Айвазян, А. Купрацэвіч і многія іншыя. Невысокі інтэлект студэнтаў — адна з галоўных прычын іх непаспяховасці.

Даволі грунтоўным, самакрытычным быў адказ на пытанне анкеты: «У чым прычына вашай дрэннай паспяховасці?» студэнта-першакурсніка ГДУ.

— Перш за ўсё ў тым, што ў 1-м семестры мы яшчэ не паспелі ўсвядоміць, што сталі студэнтамі, і што ВНУ — не школа. Той, хто добра вучыўся ў школе, спадзяваўся, што вучоба ў ВНУ пойдзе «як па маслу». Але чым бліжэй да сесіі, памылковая думка знікала і станавілася зразумела: для вучобы ва універсітэце недастаткова папярэдніх ведаў, тут трэба атрымліваць новыя. Хацелі вучыцца па прынцыпу: «Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела», але потым зразумелі, што так нельга. За некалькі дзён немагчыма было вывучыць усё тое, што было дадзена нам на працягу семестра. Атрымліваецца, мы, маладыя, не жадаем вучыцца на чужых памылках і робім свае».

Ну, а што ж старшакурснікі? У чым яны бачаць прычыны непаспяховасці?

— Тут прычына адна — несур'ёзныя адносіны да вучобы на працягу семестра, штурмаўшчына ў сесію. За некалькі дзён прадмет вывучыць немагчыма. Потым у час сесіі студэнты блытаюцца ў «трох соснах»...

— ...падрыхтоўка да заняткаў амаль зведзена на нуль. Для некаторых яна заключаецца ў беглым чытанні вучэбнага матэрыялу ў час перапынку або на лекцыі.

Так, мае месца і такая сітуацыя, калі студэнт на адной лекцыі рыхтуецца да практычных заняткаў па іншаму прадмету. Прычын адсутнасці жадання да сапраўды паслядоўнага атрымання ведаў нямала. І сярод іх — неразуменне мэты свайго знаходжання ва універсітэце. Напэўна, кожны з цяперашніх студэнтаў, паступаючы ў ГДУ, лічыў гэта важным этапам у сваім жыцці, этапам свайго далейшага развіцця, інтэлектуальнага росту, набыцця прафесіянальных навыкаў. Так думалі калі не ўсе, то большасць студэнтаў. Пры аналізе цяперашняга падыходу юнакоў і дзяўчат да мэты свайго знаходжання ў ВНУ, прыходзім да вываду, што ад гэтай мэты мала чаго засталося. Міжволі напрошваецца пытанне — чым гэта абумоўлена? Ці тым, што многія лічаць узровень сваёй адукаванасці ўжо завершаным? Наўрад да такога разважання дойдзе чалавек, які глыбока мысліць. Сумным з'яўляецца тое, што такія меркаванні ўсё ж маюць месца і многія лічаць, што цэлы рад выкладаемых для іх дысцыплін ім не патрэбен, таму ўспрымаецца імі як пусты дадатак. Многія студэнты, нягледзячы на тое, што вучацца ва універсітэце трэці ці чацвёрты год, не выпрацавалі ў сабе элементарнай здольнасці да лагічнага мыслення, дакладнага і стройнага выкладання сваіх думак. А вышэйшая адукацыя, акрамя інтэлекту як простай сумы ведаў, прадугледжвае выпрацоўку і наяўнасць у чалавеку менавіта такіх якасцей. Але, на жаль, замест пашырэння інтэлекту — убогая распіска ў сваёй нядольнасці да ўспрынятця ведаў, што праяўляецца ў двойках у час сесій.

Усе мы лічым сябе паўнапраўнымі членамі нашага грамадства. Ва ўсіх сфарміравалася пэўная сістэма жыццёвых патрэб, якія задавальняе грамадства. Але часта мы забываем спытаць саміх сябе: «А што мы можам даць грамадству, калі не цяпер, то пасля заканчэння ВНУ?» Мы абураемся, калі сутыкаемся з фактамі дрэннай работы іншых людзей, якія забяспечваюць нашы патрэбы. Але чаму не задумваемся аб якасці сваёй працы? А праца студэнта — гэта ж яго вучоба. Добрая і выдатная вучоба сёння — гэта высокая якасць працы заўтра.

У праекце ЦК КПСС аб школьнай рэформе гаворыцца аб неабходнасці павышэння ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі настаўніка. Многія выпускнікі ГДУ будуць працаваць у школе, і таму глыбока ўсвядамляюць сваю адказнасць перад грамадствам за выхаванне падрастаючага пакалення. Галоўнай сваёй мэтай яны лічаць трывалае авалоданне ведамі. Няхай дэвізам іх жыцця стануць выдатныя словы Агарова: **«Ступай, мужайся и расти. На всё кругом смотри пытливым взглядом и, действуя наперекор преградам, не уходи с заветного пути».**

**С. РЫДНЫ,**
**ленінскі стыпендыят, старшыня Савета выдатнікаў ГДУ, студэнт 4-га курса біялагічнага факультэта.**

**Г. ІЛЬЮШЧАНКА,**
**старшыня ВВК ГДУ, студэнт 4-га курса эканамічнага факультэта.**

ДУМКА ПЕРШАКУРСНІЦЫ

# ЗАЛЕЖЫЦЬ ТОЛЬКІ АД ЦЯБЕ

Калі нас, студэнтаў, знаёмыя пытаюць: «Як жывеш?», мы адказваем нешматслоўна: «Вучуся». У гэты адказ мы ўкладваем змест: «Працую». Так яно і ёсць.

Нашы равеснікі стаяць каля станкоў, вырошчваюць хлеб, але і мы робім нялёгкую і важную справу. Кожны дзень мы памнажаем галоўнае сваё багацце — веды. Памнажаем, каб аддаць потым іх спаўна. Выдатная вучоба — вось на сённяшні дзень наша работа, галоўная мэта. Як мы спраўляемся з ёй, можна меркаваць па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі.

Для нас, першакурснікаў, яна была стартавай. Які ж старт узяла наша група М-14? Яна вытрымала сесію са стопрацэнтнай паспяховасцю і заняла першае месца на матфаку разам з групай ПМ-16.

Па першай сесіі, канешне, рана меркаваць пра кожнага з нас, асабліва пра тых, хто атрымаў здавальняючыя адзнакі. Аднак факт застаецца фактам. Можна гаварыць, што заяўка ўжо зроблена.

Лічыцца, што адзнака ў залікоўцы — гэта справаздача студэнта аб адносінах да вучобы, аб якасці работы ў семестры. Экзамен — праверка адносін да працы, да абранай прафесіі, а сесія — не штурм, не бітва за адзнаку, а час асэнсавання, прывядзення ў парадак ведаў, назапашаных у семестры. Таму першае, чаго мы павінны дабівацца ў студэнтаў — гэта сталых адносін да вучобы. Не сакрэт, што многія з іх лічаць так: студэнцкія гады — тэрмін доўгі, а таму і спяшацца не трэба. Выправім, маўляў, становішча на старэйшых курсах. Такая думка — самаабман.

Мне здаецца, пяць гадоў праляцяць непрыкметна, а тое, што ты не паспееў спазнаць сёння, можа здарыцца, не спазнаеш ніколі. Утварыўшыеся «прарэхі» так і застануцца на ўсё жыццё — на іх латанне проста не будзе часу, нягледзячы на асабістыя старанні і старанні нашых выкладчыкаў. Таму давайце заўсёды прытрымлівацца мудрай парады выдатнага савецкага педагога В. А. Сухамлінскага: «Пастаў над сабой сто настаўнікаў і яны акажуцца бяссільнымі, калі ты сам не зможаш прымусіць сябе, сам патрабаваць ад сябе».

**Э. САВЯНОК,**
**староста групы М-14 матэматычнага факультэта.**

*Абмяркоўваем праект ЦК КПСС аб школьнай рэформе*

# НАСТАЎНІК, УРОК, ВУЧАНЬ...

Праект ЦК КПСС аб школьнай рэформе закранае ўсе сферы нашага жыцця, нават такія, што раней лічыліся далёкімі ад выхаваўчага працэсу.

Шмат чаго хвалюе і нас, студэнтаў, будучых педагогаў. І, перш за ўсё, якім павінен быць добры настаўнік, каб лепш выхоўваць, вучыць, рыхтаваць дзяцей да жыцця, умець ісці ў нагу з сучаснымі патрабаваннямі. Асноўнае, што мы ведаем цвёрда,— нашы выхаванцы павінны быць усебакова развітымі. А значыць, і настаўніку неабходна шмат ведаць і ўмець. І для гэтага, на думку маю і маіх таварышаў, якія ўжо дакрануліся да школьнага жыцця, трэба павысіць патрабаванне да вывучэння педагогікі і методыкі выкладання прадметаў.

Мне ўжо давялося папрацаваць у школе ў час практыкі. Праблемы школьнага жыцця паўсталі перад намі ва ўвесь свой рост. Зразумела, што ў цэнтры нашай увагі былі настаўнік, урок, вучань. Згадзіцеся, што гэта адзінае цэлае. Непрыемна было бачыць, што на ўроках некаторыя рабяты пасіўныя, недысцыплінаваныя. А адносіны да такіх пардметаў, як маляванне, спевы, фізічная культура, наогул у многіх вучняў несур'ёзныя. Зноў жа, на маю думку, рэформа павінна ўнесці карэктывы: гэтыя прадметы пажадана даручаць весці толькі спецыялістам.

Як станоўчае, сустракаюць усе педагогі прапановы па ўмацаванню статусу класнага кіраўніка. Асаблівая яго роля ў школе. Яму неабходна трымаць у полі зроку кожнага вучня, працаваць з бацькамі. Калі настаўнік-прадметнік дае ў асноўным веды, то класны кіраўнік выхоўвае — асобу, грамадзяніна. Хто, як не ён, ведае схільнасці сваіх падапечных, іх магчымасці? Класныя кіраўнікі, з якімі нам давялося сустрэцца ў час практыкі, шмат увагі ўдзялялі прывіццю спагадлівасці да людзей, выхаванню пачуцця дружбы.

Пабывалі мы ў вучняў дома. Лічылі, што практыка без гэтага будзе няпоўнай. Прычым стараліся ісці ў тыя сем'і, дзе дзецям па нейкіх прычынах няўтульна, дзе бацька і маці не могуць стаць узорам для пераймання. Розныя бачылі мы сем'і. Вось сын Алег крычыць на сваю маці: «Есці хачу, варушыся хутчэй!». Я бачыла боль у вачах маці. Чым ёй дапамагчы? Рэцэпт тут даць цяжка, трэба разважаць, трэба аб'яднаць намаганні сям'і і школы. Менавіта аб'яднаць. Таму што асобныя бацькі ўсю адказнасць за выхаванне дзяцей ускладаюць на школу, а наша хата, маўляў, з краю.

У іншых бацькоў мы спыталі, чаму іх сын так часта прапускае ўрокі працы. А ў адказ пачулі: «Нічога, яшчэ паспее напрацавацца, няхай лепш матэматыку вывучае, фізіку, мову, у інстытуце гэта патрабуюць».

І ўсе гэтыя праблемы павінны прайсці праз розум і сэрца класнага кіраўніка. Таму і ўвагі ім, умовам іх працы і аплаты трэба ўдзяліць больш.

Ды і патрабаваць з бацькоў за выхаванне дзяцей трэба больш строга. Тады б той-сёй з іх задумаўся, перш чым паспяшацца выканаць жаданне дачкі ці сына. А то ў старшакласнікаў часта цікавасць да ведаў зводзіцца амаль да нуля, і, наадварот, узрастае цікавасць да модных суkенак, дыскаў і г. д. Справа, відаць, у тым, што няўцям многім бацькам простая ісціна: той, хто змалку спазнаў працу, ведае яе цану, будзе цаніць жыццёвыя даброты.

Асаблівая ўвага ў праекце надаецца сельскім школам. Гэта нас кранае таму, што мы паедзем працаваць менавіта туды. І, зразумела, што кожны з нас ужо зараз задумваецца, як складзецца яго лёс. Думкі — розныя. Ёсць і такія студэнты, якія лічаць працу вясковага настаўніка ледзь не пакараннем. Але я ўпэўнена, што менавіта ў сельскай школе для настаўніка шырокае і плённае поле дзейнасці. Многія з нас выраслі ў вёсцы і захоўваюць да гэтага часу ўдзячную памяць пра сваіх настаўнікаў, якія ўмелі і ў паўсядзённым жыцці быць прывабнымі і прыгожымі. Тут вучань бліжэй да свайго педагога, у іх могуць наладзіцца больш цесныя сувязі. А значыць, магчымасцей уздзейнічаць на выхаванцаў таксама больш.

**І. ДЗЯГЦЯР,**
**студэнтка пятага курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Нашы юбіляры*

# ПЕДАГОГ, ДАСЛЕДЧЫК, АКТЫВІСТ



**(ДА 60-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ І 30-ГОДДЗЯ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАФЕСАРА У. Д. АРЭШЧАНКІ)**

У 1954 годзе выпускніку Бранскага тэхналагічнага інстытута Уладзіміру Арэшчанку ўручылі дыплом з адзнакай. У дадатку да яго — толькі выдатныя адзнакі. А шлях у ВНУ быў цярністым і цяжкім. Юнацтва Уладзіміра Дзянісавіча апалена Вялікай Айчыннай вайной. Ён — удзельнік баёў на І Беларускім і Карэльскім франтах. Пасля двух цяжкіх раненняў стаў інвалідам другой групы. І гэта ў 20 гадоў. Доўгі час лячэння ў шпіталях Ленінграда і на курортах Грузіі. Былі мінуты адчаю, расчаравання. Але душэўнасць і самаадданасць урачоў, клопаты і падтрымка родных і блізкіх дапамаглі Уладзіміру Дзянісавічу «стаць на ногі». Тады паўстала пытанне: як жыць далей? Да прызыву ў армію закончыў усяго 9 класаў. І вось тут праявіліся рысы яго характару — настойлівасць у дасягненні мэты, працалюбства, розум і, як кажуць, прыродная хватка.

Уладзімір Дзянісавіч паступіў у вячэрнюю школу і закончыў яе з залатым медалём. Шлях у навуку, у ВНУ быў адкрыты. Па заканчэнні інстытута Уладзіміра Дзянісавіча як аднаго з лепшых выпускнікоў накіравалі на навукова-даследчую работу ў Беларускі навукова-даследчы інстытут лясной гаспадаркі. Гэты выбар быў невыпадковым. На Гомельшчыну маладога спецыяліста пацягнулі ўспаміны аб суровых днях вайны, пралітая кроў за яе вызваленне...

У 1958 годзе Уладзімір Дзянісавіч паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Пятнаццаць гадоў яго працоўная дзейнасць была звязана з БелНДІЛГам. Тут ён прайшоў шлях ад аспіранта да загадчыка аддзела эканомікі і арганізацыі вытворчасці. У гэты перыяд вучоны актыўна працаваў над праблемамі эканомікі працы ў лясной гаспадарцы, выдаў манаграфію і некалькі брашур. Яго імя стала шырока вядомым у навуковым асяроддзі.

Найбольш поўна навукова-педагагічныя і арганізатарскія здольнасці У. Д. Арэшчанкі праявіліся ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце, дзе ў 1972 годзе ён узначаліў створаную кафедру эканомікі працы. Уладзімір Дзянісавіч многае зрабіў па яе станаўленню і развіццю, фарміраванню і з'яднанню кафедральнага калектыву, развіццю вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы. Асноўным навуковым напрамкам кафедры стала даследаванне сацыяльна-эканамічных фактараў росту прадукцыйнасці працы. Толькі за апошнія два гады эканамічны эфект ад укаранёных у вытворчасць навуковых распрацовак склаў больш 160 тыс. руб.

Калектыў кафедры, узначальваемай Уладзімірам Дзянісавічам, працуе дружна і плённа, неаднаразова выходзіў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва. Па выніках за 1983 год кафедра эканомікі працы заняла першае месца сярод грамадскіх і гуманітарных кафедр універсітэта.

Высокая навуковая кваліфікацыя, педагагічнае майстэрства і высокі аўтарытэт з'явіліся асновай прысваення ў 1981 г. ВАКам СССР У. Д. Арэшчанку вучонага звання прафесара. Уладзіміру Дзянісавічу ўласцівы глыбокі творчы падыход да вывучаемых з'яў, высокая навуковая прынцыповасць і выключная працаздольнасць. Ім апублікавана звыш 100 навуковых прац па пытаннях эканомікі і навуковай арганізацыі працы, у тым ліку 15 манаграфій, кніг, брашур і 24 вучэбныя і метадычныя дапаможнікі. Пад яго рэдакцыяй выйшлі ў свет «Практычны дапаможнік па эканоміцы працы» і манаграфія «Праблемы стабілізацыі працоўных калектываў», якія атрымалі добрую адзнаку ў рэспубліканскім і цэнтральным друку.

У. Д. Арэшчанка аддае шмат увагі і сіл падрыхтоўцы навуковай змены факультэта — аспірантам, якія робяць першыя крокі ў эканамічнай навуцы. Ён быў навуковым кіраўніком пяці паспяхова абароненых дысертацыйных работ.

У чэрвені мінулага года Уладзімір Дзянісавіч выбраны дэканам эканамічнага факультэта. Ён умела і плённа спалучае навуковую творчасць з адміністрацыйнай дзейнасцю, імкнецца ствараць атмасферу актыўнасці ў пастаноўцы, абмеркаванні і вырашэнні новых эканамічных праблем, істотнага павышэння эфектыўнасці вучэбнай, педагагічнай і навуковай дзейнасці супрацоўнікаў, выхавання сапраўдных будаўнікоў камуністычнай будучыні. Дэкан эканомфака — адзін з тых, хто ўмее быць вельмі клапатлівым і да канца прынцыповым, добразычлівым і строгім. Уладзімір Дзянісавіч надзелены талентам адчуваць, пранікаць у глыбіню чалавечай душы. Ён умее мужна адстойваць праўду жыцця, датычыцца гэта пэўнай асобы ці ўсяго калектыву.

На працягу многіх гадоў У. Д. Арэшчанка паспяхова спалучае шматгранную выкладчыцкую і навуковую працу з акыўнай грамадскай дзейнасцю. З 1973 года ён з'яўляецца членам партыйнага камітэта, а з 1976 г.— намеснікам яго сакратара, ужо адзінаццаты год узначальвае галаўную групу народнага кантролю ГДУ. Прафесар У. Д. Арэшчанка кіруе секцыяй эканомікі народнай гаспадаркі навукова-метадычнага Савета пры Гомельскім АК КПБ, выступае з лекцыямі на абласных курсах павышэння кваліфікацыі партыйных і савецкіх кадраў, з'яўляецца пазаштатным лектарам гаркома партыі. Як лектар таварыства «Веды» ён заўсёды добра ведае сваю аўдыторыю, яе інтарэсы. Таму ўсе яго лекцыі выклікаюць у слухачоў павышаную цікавасць.

Ужо некалькі скліканняў У. Д. Арэшчанка з'яўляецца дэпутатам Цэнтральнага раённага Савета народных дэпутатаў.

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Уладзімір Дзянісавіч узнагароджаны юбілейным медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», а за актыўную работу па прапагандзе эканамічных ведаў сярод насельніцтва — Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Ён удастоены таксама Ганаровых грамат Мінвуза СССР і Гомельскага абкома КПБ і абласнога Савета народных дэпутатаў.

Нягледзячы на свой узрост Уладзімір Дзянісавіч заўсёды застаецца маладым. Маладосць праяўляецца ў падтрымцы, увазе да творчасці тых, хто сёння ўступае ў навуку. Ён — вясёлы і добры чалавек — любіць гумар, жарт і ўмее карыстацца імі. Ведае цану дружбы і таварыскасці.

Як сапраўдны вучоны У. Д. Арэшчанка правільна ацэньвае мінулае, цвяроза асэнсоўвае цяперашняе, пранікнёна глядзіць у будучыню. Ён ва ўзросце творчай сталасці. І мы ўпэўнены, што яшчэ неаднойчы парадуемся яго новым навуковым поспехам.

Нястомнай навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасцю, вялікімі клопатамі аб растучай змене Уладзімір Дзянісавіч заслужыў шырокую павагу і вялікі аўтарытэт. З нагоды яго юбілею ўвесь калектыў эканамічнага факультэта, яго вучні сардэчна жадаюць яму моцнага здароўя, творчага даўгалецця, асабістага шчасця і новых поспехаў ва ўсіх справах на карысць нашай Радзімы!

**А. НЯВЕРАЎ,**
**загадчык кафедры галіновых эканомік, дацэнт.**
**Г. БАЛТРУШЭВІЧ,**
**дацэнт кафедры эканомікі працы.**

# З КАНЦЭРТАМ—ДА ВОІНАЎ

Адзін з лепшых выпускнікоў ГДУ Віктар Маючы служыць цяпер у радах Савецкай Арміі. Але сувязі з родным факультэтам не парывае: часта прыходзяць студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта пісьмы, у якіх юнак піша аб сваёй службе, салдацкіх буднях, цікавіцца, чым жыве факультэт цяпер. Віктар на працягу некалькіх гадоў узначальваў культурна-масавую работу на гістфіле, таму добра ведае, што ёсць сярод студэнцкай моладзі нямала аматараў мастацкай самадзейнасці. Вырашыў воін па просьбе сваіх сяброў-салдат запрасіць прыехаць да іх, у воінскую часць, агітбрыгаду гістфіла.

І вось агітбрыгада ў саставе 11 чалавек — у дарозе. Іх шлях ляжыць у сталіцу савецкай Латвіі — г. Рыгу. У вагоне цягніка рабяты зноў ўдакладняюць праграму канцэрта, дапаўняюць яе новымі нумарамі, рэпетыруюць. Непрыкметна ляціць час у дарозе — вось ужо і г. Рыга. Цэлы дзень знаёміліся рабяты з выдатнымі мясцінамі горада, яго саборамі, помнікамі, мастамі праз Даўгаву, а ноччу цягнік павёз іх далей да месца прызначэння. На вакзале іх ужо чакалі прадстаўнікі воінскай часці. Пасля вырашэння арганізацыйных пытанняў, рэпетыцыі вечерам у салдацкім клубе адбыўся канцэрт. Доўгімі, гарачымі апладысментамі не адпускалі гледачы са сцэны танцораў Ігара Бандаровіча і Наташу Янкову, Аляксея Нікалаенку, які чытаў вершы савецкіх паэтаў, Марыну Шырынкіну.

Пасля канцэрта студэнты слухалі цікавы расказ воінаў аб іх службе, дзяліліся сваімі навінамі аб універсітэцкім жыцці.

...Пад стук колаў мы ўспаміналі радасныя твары, усмешкі стаўшых блізкімі нам воінаў, іх цёплыя словы на развітанне.

**Ігар ЛАПІЦКІ,**
**студэнт групы Р-13**
**гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Пазаўчора на базе нашага універсітэта адбылася міжвузаўская навукова-практычная канферэнцыя «Гаспадарчы механізм развітога сацыялізму і яго роля ў павышэнні эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і снежаньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС».

У канферэнцыі прынялі ўдзел вядучыя вучоныя-эканамісты Гомельшчыны і некаторых ВНУ рэспублікі, кіруючыя спецыялісты з вытворчасці, аспіранты і студэнты.

На пленарным пасяджэнні было заслухана чатыры даклады. Адзін з іх — «Гаспадарчы механізм прадпрыемстваў і вытворчых аб'яднанняў і асноўныя напрамкі яго ўдзеяння на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання рабочай сілы» — быў падрыхтаваны загадчыкам кафедры палітэканоміі нашага універсітэта У. Ф. Бондаравым і дацэнтам гэтай кафедры М. М. Маёравым.

Пасля пленарнага пасяджэння канферэнцыя працягвала работу па секцыях.

**(Наш кар.).**

# ЁН КЛІКАЎ ДА ВОЛІ І ЗМАГАННЯ

Савецкі народ і ўсе прагрэсіўнае чалавецтва адзначылі 170-годдзе з дня нараджэння геніяльнага паэта Украіны, палымянага рэвалюцыянера-змагара Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі.

Творчасць Шаўчэнкі захапляе перадавых людзей усяго свету сваёй прыгажосцю, сваей сілай і мудрасцю, яна выклікае пачуццё гонару і глыбокай павагі да чалавека, які сваё жыццё прысвяціў барацьбе супраць несправядлівасці, сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Паэзія гэтага выдатнага мастака слова выпраменьвае ззянне высокага патрыятызму, веры ў магутную сілу народа, цвёрдай упэўненасці ў перамозе дабра над злом.

Першыя творы паэта датуюцца 1837 годам. У 1839 годзе ён падрыхтаваў да выдання першы зборнік «Кабзар», ў пачатку 1840 года кніга ўбачыла свет. Ужо назвай зборніка ўкраінскі паэт заявіў: ён выступае песняром народа, працоўных людзей, да якіх належыць і сам. Мы гаворым: «Кабзар» — і перад намі паўстае поўнае выпрабаванняў жыццё паэта. Мы называем імя Шаўчэнкі — і перад вачамі ўзнікае славутая кніга, якая ўвабрала ў сябе яго бязмежны талент, яго неймаверныя пакуты і ў той жа час сапраўдную нязломнасць духу барацьбіта за волю. Спачатку «Кабзар» складаўся толькі з 8 твораў, напісаных у 1838—1839 гадах. Гэта невялікая кніжачка адкрыла ўкраінскай літаратуры новы паэтычны свет. Шаўчэнка вывеў украінскую літаратуру на шлях крытычнага рэалізму. Наватарскае значэнне вершаў і паэм Шаўчэнкі вызначаецца перш за ўсё іх глыбокай народнасцю і дэмакратызмам. Паэзія Кабзара блізкая да народнай паэзіі і сваімі тэмамі, і вобразамі, і мілагучным песенным ладам. Гаворачы пра блізкасць творчасці Шаўчэнкі да фальклору, беларускі паэт М. Багдановіч пісаў: «Ёсць зоркі, такія блізкія адна да адной і так роўна злучаюць сваё святло, што здаюцца нам адным непадзельным цэлым. «Двайнымі зоркамі» называюцца гэтыя свяцілы. Іх лёс стаў лёсам музы Шаўчэнкі і ўкраінскай народнай паэзіі...» Раннія балады рамантычнага характару («Прычынна», «Таполя») ўвайшлі ў народны песенны рэпертуар. У аснове іх сюжэта — каханне казака і дзяўчыны. У баладах паэт сцвярджае права чалавека на шчасце. Асобнае месца ў ранняй творчасці Шаўчэнкі займае яго паэма «Кацярына», у якой упершыню ва ўкраінскай паэзіі паказана сацыяльная трагедыя маці-сялянкі ў прыгонным грамадстве. У творах «Іван Падкова», «Тарасова ноч» (1839 г.) Шаўчэнка звярнуўся да адлюстравання нацыянальна-вызваленчай барацьбы ўкраінскага народа. Паэт быў захоплены веліччу народнай барацьбы за свабоду і незалежнасць, кожным радком сцвярджае ён упэўненасць у перамозе над прыгнятальнікамі.

**Наша думка, наша пісня**
**Не вмре, не загіне...**
**От де, люде, наша слава,**
**Слава України!**

У 1841 годзе асобным выданнем выйшла яго славутая паэма «Гайдамакі», у якой уваскрашаецца карціна магутнага ўсенароднага паўстання на Украіне ў 1768 годзе супраць польскай шляхты, вядомага ў гісторыі пад назвай «Калііўшчына». Паэма адлюстроўвала і ўслаўляла рэвалюцыйную энергію і актыўнасць украінскага народа ў барацьбе за сваю волю і незалежнасць. Паэт абвінавачваў пануючыя класы ў тым, што ўкраінскі і польскі народы пралівалі кроў у бязлітасных войнах:

**Болить серце, як згадаеш:**
**Старих слов'ян діти**
**Впились кров'ю.**
**А хто винен?**
**Ксьондзи, езуіти...**

1843—1847 гады сталі значнай вяхой у біяграфіі паэта. Ён выступае у літаратуры як выдатны майстар крытычнага рэалізму, рэвалюцыйны дэмакрат і матэрыяліст.

У 1844 годзе выходзіць другое выданне «Кабзара» пад назвай «Чыгірынскі Кабзар». Паэт стварае цэлы рад новых паэм і вершаў — «Сон», «Каўказ», «Ерэтык, «Запавет» і інш., у якіх яскрава адлюстраваліся жыццё і імкненні ўкраінскага народа, працоўнага сялянства. У гэтых шаўчэнкаўскіх творах знайшла сваё бліскучае мастацкае ўвасабленне ідэя неабходнасці і непазбежнасці рэвалюцыйнага пераўтварэння грамадскага і палітычнага ладу Расіі.

У чэрвені 1844 года Шаўчэнка напісаў сагырычную паэму «Сон». Веліч, магутнасць рэвалюцыйнай думкі робяць гэту паэму адным з самых геніяльных твораў не толькі ўкраінскай, але і сусветнай літаратуры. Паэт малюе жорсткі прыгнёт народа рускімі царамі. Далучаючы свой голас да голаса Пушкіна, Шаўчэнка славіць пакараных смерцю і сасланых у Сібір дзекабрыстаў.

Ідэя яднання ўсіх прыгнечаных народаў Расіі гучыць у паэме «Каўказ». У кожным радку — лютая нянавісць паэта да цара і ўсіх прыгнятальнікаў.

У 1847 годзе Тарас Шаўчэнка быў арыштаваны. Вядомага ў той час па ўсёй Расіі і за яе межамі славутага пісьменніка цар засудзіў на 10 гадоў радавым у салдатчыну «пад найстражэйшы нагляд і з забаронай пісаць і маляваць». Творы ўкраінскага паэта былі забаронены. Царызм спадзяваўся, што служба ў войску зломіць волю паэта да барацьбы за свабоду, вынішчыць рэвалюцыйны дух з яго паэзіі. Нягледзячы на суровую забарону, Шаўчэнка і ў няволі не пакідаў пісаць. Да «нявольніцкай» паэзіі адносяцца вершы і паэмы: «О думы мае», «Цары», «Варнак», каля 20 аповесцей на рускай мове. Гэтыя творы сведчаць аб нязломнасці рэвалюцыйнага духу паэта. Паэт пачынае весці «дзённік», у якім занатоўвае свае думкі, перажыванні, імкненні, спадзяванні.

У 1857 годзе паэт вяртаецца з ссылкі і працягвае барацьбу супраць прыгонніцтва, кліча працоўны люд да змагання. У гэты час з-пад пяра Шаўчэнкі выходзяць творы «Юродзівы», «Неафіты», «Свеце ясны» і інш.

У 1850 годзе ў Пецярбургу выйшла новае выданне «Кабзара», якое мела вялікі поспех. Але сілы паэта былі падарваны. Раніцай 10 сакавіка 1851 года геніяльнага паэта не стала. Смерць Шаўчэнкі балюча перажывала ўся працоўная і рэвалюцыйная Украіна і Расія.

Як многа зрабіў за сваё жыццё гэты найвялікшы пісьменнік свету! Паэтычны свет Шаўчэнкі шырокі і неабдымны, як бяскрайнія абсягі яго любімай Бацькаўшчыны.

Творы Кабзара чытаюць людзі ва ўсім свеце, яны родныя і блізкія нам, беларусам, як блізкі ўвесь гістарычны лёс братняга нам украінскага народа.

Вялікі пясняр заклікаў народ разарваць ланцургі, палымяна клікаў да волі. І воля прыйшла.

**Ані слёз тых, ані гора,**
**Ні цара, ні пана!..**
**Эх, Кабзар,**
**каб ты збудзіўся,**
**На Украіну глянуў!..** —

звяртаўся Янка Купала да ўкраінскага паэта.

Каб мог глянуць Кабзар, як жывуць сёння ўсе народы нашай краіны, ён пабачыў бы іх у радасці і шчасці.

**Л. КРЫШЧЫК,**
**студэнтка 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Да «Дзён донара»*

# ГАНАРОВА, ВЫСАКАРОДНА

З 20 па 23 сакавіка ў нашым універсітэце будуць праводзіцца «Дні донара». Бязвыплатнае донарства ў нашай краіне шырока папулярызуецца і заахвочваецца. Наш універсітэт заўсёды займаў адно з першых месц па колькасці донараў сярод ВНУ рэспублікі. «Дням донара» ва універсітэце забяспечваецца высокі арганізацыйны ўзровень. Актыўны ўдзел у іх правядзенні прымаюць рэктарат, партком, прафком студэнтаў, камітэт камсамола, камітэт таварыства Чырвонага Крыжа, дэканы факультэтаў. За актыўны ўдзел у бязвыплатным донарстве 130 студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў ГДУ ўзнагароджаны ў мінулым годзе медалямі «Донар СССР III ступені».

«Наша кроў,— гавораць донары ўніверсітэта,— вяртае здароўе тым, хто канструіруе машыны і будуе заводы, хто сее і ўбірае хлеб. Мы на асабістым вопыце пераканаліся, што донарства абсалютна бясшкодна».

Адзін з асноўных прынцыпаў донарства ў нашай краіне — «Ніякай шкоды донару — максімум карысці хвораму». Таму кожны донар абавязкова абследуецца ўрачом. У нашых донараў бяруць 210 мл крыві. Гэта не шкодзіць арганізму, і ён сам спраўляецца з гэтай невялікай кровастратай. Частка крыві чалавека знаходзіцца як бы ў запасе ў нашых органах — селязёнцы, печані і г. д.

Донарства не толькі не шкодзіць чалавеку, але аказвае на яго здароўе спрыяльнае ўздзеянне. У яго павышаецца абмен рэчываў, паляпшаецца самаадчуванне і настрой.

Уступайце ў рады донараў!

**І. СЯРОГАЎ,**
**старшыня камітэта пярвічнай арганізацыі таварыства Чырвонага Крыжа.**

*Прапануюць кнігарні*

# ДЛЯ ФІЛОЛАГАЎ

Увазе студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта прапануюцца кнігі:

**Краўцоў Н. І., Лазуцін С. Г.** «Руская вусная народная творчасць», М., Вышэйшая школа, 1983 г.

У падручніку змешчана характарыстыка своеасаблівасці жанраў фальклору і гісторыяграфіі. У параўнанні з першым выданнем (выйшла ў 1977 г.) падручнік дапоўнены новымі раздзеламі: «Прымаўкі», «Іграvыя, карагодныя і танцавальныя песні», «Дзіцячы фальклор», «Гісторыя збірання і вывучэння фальклору».

**Новікава А. М.** «Руская паэзія XVIII стагоддзя і народная песня», М.: Просвещение, 1982 г.

У кнізе разглядаюцца шляхі развіцця кніжнай і народнай паэзіі і вынікі іх узаемаўплыву. У кожным раздзеле, разам з жанравай характарыстыкай на фоне ўзаемаадносін рускай паэзіі і народнай песні, даецца аналіз творчасці паэтаў XVIII — першай палавіны XIX стагоддзяў. Кніга дапаможа студэнтам шырэй пазнаць культуру рускай паэтычнай школы.

**В. Піскуноў.** «Тэма аб Расіі», М.: Савецкі пісьменнік, 1983 г.

У кнізе разгорнута шырокая панарама айчыннай культуры, а таксама ідэалагічных спрэчак творчай інтэлігенцыі пачатку XX ст., у цэнтры якіх стаяла «спрэчка аб Расіі». Аналізуючы творчасць Л. Талстога, Горкага, Блока, Белага, Буніна і іншых пісьменнікаў, аўтар прыходзіць да вываду аб арганічнасці для Расіі рэвалюцыйных пераўтварэнняў, аб найбольшай плённасці тых мастацкіх сістэм, якія сцвярджалі рэвалюцыі як гістарычную заканамернасць.

**Э. Скобелеў.** «Из тьмы светлеющие лики», Мн., Мастацкая літаратура, 1983 г.

Кніга ўключае тры паэтычныя драмы: «На Куліковa — цяжкі шлях» апавядае аб гераічным подзвігу рускага народа — барацьбе супраць татара-мангольскай орды; «Слёзы Джардана» расказвае аб трагічным лёсе Джардана Бруна, выдатнага гуманіста сярэднявякоўя; «Эдып неразумны» уяўляе арыгінальны варыянт асэнсавання вядомага антычнага міфа.

Кнігі вы можаце набыць у кніжным магазіне № 11 на праспекце Касманаўтаў, 10.

**А. РАДЫЁНАВА,**
**загадчыца кнігарні № 11.**

# У РЭСПУБЛІКАНСКІХ ВЫДАВЕЦТВАХ

«БДУ імя У. І. Леніна» і «Вышэйшая школа» выйшлі ў свет кнігі, якія зацікавяць студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ:

**Нядзеля Л. І.** Маральныя асновы сацыялістычнага ладу жыцця.

Народная лексіка Гомельшчыны ў фальклоры і мастацкай літаратуры.

**Гусак А. А.** Вышэйшая матэматыка, том 1.

**Яфімава М. Б.** Цэлы свет — дзецям.

**Гусак Г. М.** Сістэмы алгебраічных ураўненняў.

**Ляшчынская В. А., Смыкоўская В. І.** Педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў.

Эканоміка прамысловасці СССР.

Названыя кнігі можна купіць у магазіне № 19 па вул. Савецкай, 106.

**Е. ГРАБЦЭВІЧ,**
**прадавец магазіна.**

У СВЕЦЕ ЦІКАВАГА

# ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ РЭКІ ЗЯМЛІ

Тое, што зямныя нетры амаль паўсюдна ўтрымліваюць ваду — факт відавочны для ўсіх. А вось тое, што ў іх цякуць электрычныя токі, ведаюць не многія. Токі, якія цякуць на вялікіх глыбінях, у мантыі, з'яўляюцца крыніцай магнітнага поля Зямлі. А вось токі, якія цякуць у верхняй тоўшчы, блізка каля паверхні Зямлі, абавязаны сваім паходжаннем Сонцу. Чым больш пераменная энергія Сонца ўплывае на калязямную прастору, тым большай магутнасці ў зямной тоўшчы ўзбуджаюцца электрычныя токі. Яны канцэнтруюцца ў высокаправодзячых зонах, утвараючы вялізныя замкнёныя кольцы. Такі электрычны канал праходзіць у раёне Чарнігава паўднёвей Гомеля, у раёне Жлобіна і далей у паўночным напрамку. Велічыня току ў канале складае сотні ампер.

Вучоныя навучыліся выкарыстоўваць зямныя токі для даследавання геалагічнай будовы. У асадкавай тоўшчы ўпершыню ў СССР даследаванні былі праведзены ў пачатkку 50-х гадоў на тэрыторыі Гомельскай вобласці. У далейшым была даследавана ўся тэрыторыя рэспублікі. У гэтай вялікай рабоце прымалі актыўны ўдзел і вучоныя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

**А. ПІНЧУК,**
**дэкан геалагічнага факультэта, дацэнт.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Калектыў кафедры радыёфізікі выказвае глыбокае спачуванне інжынеру кафедры САЛАЎЮ Алегу Мацвеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 41173

Зак. 1082